эвалюцыі сінтаксічнага ладу мовы. Важным кірункам даследавання і апісання мовы і маўлення з'яўляецца таксама С. тэксту, стылістычны, аўтарскі і інш. С. мовы непасрэдна звязаны з інш. ўзроўнямі і адзінкамі моўнай сістэмы — гукавым ладам, марфемікай, словазмяненнем, працэсамі словаўтварэння, лексіка-семантычнымі групоўкамі слоў і іх спалучальнасцю, семантыкай і ідыяматыкай. Бел. мова ў працэсе гіст. развіцця і функцыянавання назапашвае індывід. сінтаксічныя звароты, канструкцыі, спалучэнні, якія складаюць адзін з аспектаў яе нац. спецыфікі.

*Літ.:* Міхневіч А.Я. Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы. Мінск, 1976; Беларуская граматыка. Ч. 2. Сінтаксіс. Мінск, 1986.

**СІНТЭТЫЧНЫЯ МОВЫ**, мовы, у якіх пераважаюць сінтэтычныя формы выражэння граматычнага значэння. У С.м. граматычнае значэнне выражаецца ў межах самога слова пры дапамозе афіксаў (прыстаўка, суфікс), флексій, змены націску («рукі» — «рукі»), унутраных флексій («збіраць» — «сабраць»), трансфіксаў (у семіцкіх мовах — афікс з галосных, што ўключаецца ў трохкансанантны корань слова), суплетыўных відазмяненняў («дрэнны» — «горшы») ці паўтору марфем (напр., стараслав. формы імперфекту: «знаахъ», «прошаахъ»). Да С.м. належаць усе слав. (акрамя балгарскай), літоўская, ням., арабская і інш. мовы. С.м. проціластаўляюцца ізаляваным, аналітычным і полісінтэтычным мовам, дзе граматычныя значэнні не выражаюцца ці выражаюцца за межамі слова (службовымі словамі, артыклямі, прыназоўнікамі і інш.) і цэлымі комплексамі паказчыкаў адпаведна.

*Літ.:* Мечковская Н.Б. Структурная и социальная типология языков. М., 2001; Рагаўцоў В.І. Агульнае мовазнаўства. Магілёў, 2006.

*С.У.Шахоўская.*

**СІПАКОЎ** Янка (Іван Данілавіч; 15.1.1936, в. Зубрэвічы Аршанскага р-на — 10.3.2011), беларускі пісьменнік. Засл. дзеяч культуры Беларусі (1997). Скончыў БДУ (1960). З 1960 працаваў у час. «Вожык», з 1973 — у час. «Маладосць», з 1993 — у выд-ве



*Я.Сіпакоў.*

«Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», у 1997—2005 — у час. «Беларусь». Яго паэзіі ўласцівы лірызм, рамантычная ўзвышанасць, выразнасць паэт. карціны, жанравая разнастайнасць. Аўтар зб-каў паэзіі «Сонечны дождж» (1960), «Лірычны вырай» (1965), «Веча славянскіх балад» (1973), «У поўдзень, да вады» (1976), «Усміхніся мне» (1984); кніг «Жанчына сярод мужчын» (1980), «Спадзяванне на радасць» (1983), «Журба ў стылі рэтра» (1990), «Вецер на даху вагона» (2003), «Спаталенне смагі: дзённік настрою» (2007), «Зялёны лісток на планеце Зямля» (2010) і інш. Развіваў у бел. л-ры жанры прытчаў (зб. «Тыя, што ідуць», 1993), паэм у прозе («Ахвярны двор», 1991). Дзярж. прэмія Беларусі 1976.

*Тв.:* Сад людзей: выбр. творы. Т. 1—2. Мінск, 1985; Выбр. творы. Т. 1—2. Мінск, 1995—97; Падары нам дрэва. Мінск, 1997; Жыві як хочацца: аповесці. Мінск, 2000.

*Літ.:* Позняков М. С любовью к народу и Родине // Неман. 2007. №2.

**СІРОЦКІЯ ПЕСНІ**, жанравая група лірычных песень, у якіх раскрываецца цяжкае жыццё сіраты. Яны самыя журботныя і тужлівыя ў песенным фальклоры беларусаў: «На бацькоўскім сыне // Вышыта сарочка, // А на сіраціне // Няма ні рубочка. // Па бацькоўскім сыне// Бацька, маці плача, // А па сіраціне // Чорны воран крача. // Па бацькоўскім сыне // Музыкі іграюць, // А па сіраціне // Слёзы праліваюць». Адзінота і адрынутасць з'яўляюцца пастаяннымі спадарожнікамі сіраты («Ой, палын, палын — трава горкая, // А доля мая яшчэ горшая»). Вобраз сіраты найбольш любімы ў народзе, яму спачуваюць і аўтар-песнятворца, і нават сам Бог. Увага да сіроцкага лёсу — адна з праяў прыроднай гуманнасці беларусаў. У наш час С.п. маюць пазнавальнае значэнне, знаёмяць з мінулым нашых продкаў, іх думкамі, перажываннямі, імкненнямі.

*А.М.Аляхновіч.*

**СІТНІЦА** Рыгор Сямёнавіч (н. 1.1.1958, в. Курыцічы Петрыкаўскага р-на), беларускі мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1982). У 1983—2008 выкладаў у Гімназіі-каледжы мастацтваў імя І.В.Ахрэмчыка. З 2007 1-ы нам. старшыні, з 2013 старшыня Бел. саюза мастакоў. Для творчасці характэрна спалучэнне супрэматычных і канструктывісцкіх прынцыпаў у пабудове кампазіцыі, гіперрэаліст. трактоўка формы, сімвалічнасць маст. мовы. Творы вылучаюцца непаўторнай адметнасцю аўтарскага стылю, вытанчанай эстэтычнай культурай і гістарычна-патрыятычнай тэматыкай. Аўтар графічных лістоў «Кветкі для Іны» (1981), «Кліч матчынай песні» (1986), «Мастак Язэп Драздовіч» (1987), «Няміга» (1994), «Каложа» (1995), «Касцёл Святой Ганны ў Вільні» (2014), серый «Беларускія народныя майстры» (1982), «Імгненні

*Р.Сітніца. З серыі «Гаспода». 1998—2008.*



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ